УДК 81:008

# РАДЗІМА І ПАТРЫЯТЫЗМ У ЛЮСТЭРКУ БЕЛАРУСКІХ ПРЫКАЗАК І ПРЫМАВАК

**Р.А. Цярэшка**, 10 “Б” клас
Навуковы кіраўнік – **Н.У. Магер**, настаўнік
**Ліцэй Палескага дзяржаўнага ўніверсітэта**

У XXI стагоддзі, якое многія людзі ўсведамляюць як стагоддзе глабалізацыі, адбываецца фарміраванне адзінай сусветнай эканамічнай, фінансавай і інфармацыйнай прасторы. Адносна людзей глабалізацыя перш за ўсё выяўляецца ў міграцыі працоўнай сілы, якая ў сучасным свеце стала часткай міжнародных эканамічных адносін. На думку вучоных-эканамістаў і сацыёлагаў, міграцыя пашыраецца ў сувязі з міжнародным падзелам працы і ўзмацненнем узаемазалежнасці нацыянальных эканомік.

У век глабалізацыі і ўсеагульнай міграцыі насельніцтва асаблівае значэнне набывае духоўная сувязь чалавека з радзімай, з роднымі мясцінамі, адчуванне сваіх каранёў, прыхільнасць да роднай хаты.

Беларускія прыказкі і прымаўкі аб радзіме і чужыне і ў далёкія часы, і ў нашы дні ў поўнай меры выказваюць любоў беларусаў да радзімы, непарыўную сувязь з ёй, іх патрыятызм:

*Дадому і конь спрытней бяжыць.*

*Жонка як жонка, але мілей родная старонка.*

*Зямелька – наша матка: і корміць, і поіць, і адзявае нас.*

*Мілы той куток, дзе рэзан пупок.*

*Нідзе так, як дома.*

*На Беларусі пчолы як гусі, рэзгінамі мёд носяць.*

*Родная зямелька – як зморанаму пасцелька.[1, с.58]*

Патрыятызм беларусаў - не толькі вынік ўсведамлення велічы дасягненняў сваёй краіны Беларусі. Гэтае пачуццё больш арганічнае, эмацыйнае. Яно выяўляецца ў амаль фізічнай прыхільнасці беларусаў да месцаў свайго дзяцінства і юнацкасці, хваравітай настальгіі ў выпадках растання са сваёй радзімай, практычнай немагчымасці шчасна ўкараніцца ў іншых краінах.

Гэтыя эмоцыі адлюстроўваюць наступныя прыказкі:

*На чужыне і камар загіне.*

*У чужой старонцы не так свеціць і сонца.*

*У чужой старонцы рад сваёй варонцы.*

*Дома і салома ядома, а на чужыне і гарачы тук стыне.*

*З’ехаў на чужыну – як зваліўся ў дамавіну.*

*Далекая старонка без ветру сушыць. [1, с.58]*

З прыведзеных прыкладаў відаць, што для называння чужой зямлі, іншай краіны беларусамі выкарыстоўваліся такія найменні, як чужына і чужая старонка.

Беларус, які з’ехаў за мяжу, пад словам радзіма мае на ўвазе перш за ўсё Беларусь. Але прыказкі ствараліся ў даўнія часы і ў большасці сваёй сялянамі, якія не часта бывалі ў замежжы. Для іх чужынай лічылася ўсё, што ляжала за межамі іх валасці, павета і да т.п. Таму многія старыя прыказкі пра радзіму і чужыну адносяцца да таго кутка, месца, дзе чалавек нарадзіўся, дзе яму ўсё блізка і знаёма. Аднак у наш час больш актуальным становіцца ўжыванне дадзеных прыказак у шырэйшымм сэнсе, гэта значыць у адносінах да радзімы-краіны, да айчыны, да Беларусі.

Любоў да роднага кутка выказваюць такія прыказкі:

*Дайду да свайго роду, хоць праз воду.*

*Для ўсякай птушкі сваё гняздо мілае.*

*Кожнаму дразду жаль па сваім гнязду.*

*Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне матка.*

*Дзе воўк урадзіўся, яму кут той мілы.*

*Родная зямелька як зморанаму пасцелька.*

*Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы. [1, с.58]*

На радзіме чалавек заўсёды пачуваецца вальней, смялей. Гэта надае яму моц і ўпэўненасць.

Таму і кажуць:

*Ідзі ў родны край, там і пад елкаю рай.*

*У родным краі як у раі.*

*Лепей у сваіх людзях з голаду паміраць, чым у чужых людзях золата збіраць.*

*У сваёй хаце і качарга маці.*

*У чужым краі толькі вецер зжаліцца.[1, с.60]*

Такім чынам, для беларусаў паняцце радзіма аб'ядноўвае два пачаткі: радзіма-краіна і радзіма-куток, месца, дзе чалавек нарадзіўся. Радзіма для сучаснага беларуса - гэта не толькі Беларусь з драматычнай гісторыяй і вялікай культурай, гэта таксама вёска, пасёлак ці мястэчка, дзе ён вырас; гэта родны дом, двор, вуліца, дзе ён правёў дзяцінства; гэта родная школа і сябры дзяцінства і юнацкасці; гэтае дрэва, якое ён сам пасадзіў у садзе, гэта лес, поле і прасторы вакол. Усё гэта блізкае і роднае для кожнага беларуса ўваходзіць у паняцце малая радзіма.

У значнай частцы прыказак сцвярджаецца, што беларусы не схільны да таго, каб прамяняць сваю Радзіму на іншыя заморскія краіны і землі з рознымі матэрыяльнымі выгодамі і зручнасцямі, бо свая зямля для іх самая лепшая.

*З'ехаў на чужыну - як зваліўся ў дамавіну.*

*Лепей у сваіх людзях з голаду паміраць, чым у чужых людзях золата збіраць.*

*Не ўсякі добры кут - чалавеку бацькаўшчына.*

*У роднай староначчы птушачкі пяюць, а ў чужой староначчы часта слёзы льюць.*

*Усюды добра,а дома лепей.*

*Чым за морам віно піць, лепей з Нёмана вадзіцу. [1, с.58]*

У апошняй прыказцы Нёман, як адна з найбуйнейшых рэк нашай Радзімы, выступае ў пэўнай ступені сімвалам Беларусі.

Народ асуджае тых людзей, якія забыліся пра сваю Радзіму і імкнуцца быць як мага далей ад роднага бацькоўскага жытла:

*Благая тая птушка, што свайго гнязда не пільнуецца.*

*Дзяржыся з варонаю і вераб'ём, што ў вырай не ляцяць.*

*З'ехаў на чужыну – як зваліўся ў дамавіну.*

*Не дай, божа, у прымах жыць і на чужой зямлі загінуць.*

*Не той перамагае, хто са сваёй зямелькі ўцякае. [1, с.59]*

Народная мудрасць папярэджвае аб тым, як цяжка прыйдзецца таму, хто вырашыў памяняць родны куток на чужыну:

*Чужына - не родная матка, хлеба не дасць.*

*Чужая старана пірагамі не накорміць.*

*Хто страціў радзіму, той плача ўсё жыццё. [1, с.60]*

Звяртаецца ўвага на тое, что чалавек, які цураецца сваёй радзімы, здольны здрадзіць і блізкім:

*Хто роднага краю цураецца, той і маткі сваёй адцураецца.*

Такім чынам, беларускія прыказкі і прымаўкі пра радзіму і патрыятызм выразна семантызуюць любоў і адданасць беларусаў свайму народу, паважлівыя адносіны да сваёй зямлі, на якой яны нарадзіліся і выраслі. Радзіма - гэта самае дарагое для чалавека. Як адзначае В.А. Маслава, "беларусы - менш схільныя да перамяшчэнняў, гэта дастаткова аседлая нацыя, сярод іх нават зараз амаль няма эмігрантаў. А вымушаная эміграцыя цяжка перажываецца імі" [2, с. 66].

Разгледжаны моўны матэрыял дапамагае не толькі вызначыць этнічную спецыфіку беларусаў як нацыі, але і прэзентуе духоўныя каштоўнасці і арыенціры нашых продкаў, адлюстроўвае традыцыйнае мысленне, якое абумоўлена культурна-нацыянальным светабачаннем і ментальнымі асаблівасцямі беларускага народа. Аналізуючы прыказкі і прымаўкі тэматычнага кола "Радзіма, патрыятызм", мы прыйшлі да высновы, што для беларускай ментальнасці адданасць і любоў да сваёй айчыны, патрыятызм з'яўляецца найважнейшым складнікам у шэрагу асноўных нацыянальных каштоўнасцяў і прыярытэтаў, уласцівых беларусам.

**Спіс крыніц літаратуры**


1. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / склад.Ф. Янкоўскі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 493 с.

2. Маслова В.А. Введение в лингвокультурологию. М., 1997